**Казаніна Віёла Юр'еўна,**
*магістр мастацтвазнаўства,*
*аспірант кафедры беларускай і сусветнай*
*мастацкай культуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў;*
*навуковы кіраўнік – доктар філасофскіх навук, прафесар*
*Дарашэвіч Энгельс Канстанцінавіч*

# НЕГЛЮБСКІ ТЭКСТЫЛЬ НА АРТ-РЫНКУ АНТЫКВАРЫЯТУ І ЭТНАТАВАРАЎ XXI СТАГОДДЗЯ

Дзейнасць па захаванні і развіцці нацыянальных культур у XXI стагоддзі, як правіла, канцэнтруецца вакол найбольш адметных праяў народнай творчасці і традыцыйнага мастацтва. Каб у эпоху «інфармацыйнага выбуху» прывабіць увагу, намаганні і рэсурсы людзей да нейкага этнічнага мастацка-культурнага феномену, гэты феномен мусіць быць і знакавым для этнасу, і высокамастацкім, і карыстацца побытам. Неглюбскі тэкстыль на арт-рынку антыкварыяту і этнатавараў Беларусі XXI стагоддзя запатрабаваны і прадстаўлены даволі разнастайна: ручнікі, абрусы, кашулі, жаночыя галаўныя ўборы і спадніцы, вытканыя і расшытыя майстрыхамі з вёскі Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. Сёння такія рэчы можна сустрэць і ў антыкварных крамах, і ў сувенірных кіёсках, і на кірмашах, прымеркаваных да народных свят і імпрэзаў Беларусі.



Малюнак 1 – Узоры неглюбскага арнаменту

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Малюнак 2 – Неглюбскі строй



Малюнак 3 – Неглюбскія ручнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У асяродку аматараў усходнееўрапейскага традыцыйнага мастацтва неглюбская мастацкая традыцыя стала вядомай у 1970-я гады пасля шэрагу выстаў і сацыякультурных акцый. Старонка Нацыянальнага інвентару гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, прысвечаная неглюбскаму тэкстылю, паведамляе: «На Усесаюзнай выстаўцы-конкурсе майстроў народнага мастацтва… (Масква, 1970) Беларусь была прадстаўлена дзесяццю работамі, шэсць з якіх – неглюбскія ручнікі Е. С. Барсуковай, Т. Ф. Дзеранок, М. А. Прыходзька, Е. Я. Суглоб. З таго часу Неглюбка стала вядома

як адметны цэнтр сучаснага ручнога ткацтва і вышыўкі… не толькі на выставах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў СССР, але ў Італіі, Германіі, Велікабрытаніі, Японіі, Бельгіі, Францыі, Канадзе, ЗША» [4].

Увагу прафесійных мастацтвазнаўцаў і калекцыянераў прывабіў да Неглюбкі беларускі даследчык, доктар мастацтвазнаўства Міхась Раманюк (1944–1997), які змясціў фатаздымкі неглюбскага строю ў сваім выданні па касцюме [2]. Навукоўцы і чытачы кнігі заўважылі, што элементы мясцовага строю (кашулі, наміткі, хусткі, гарсэткі, галаўны ўбор дзяўчыны – «кубак», галаўны ўбор жанчыны – «плат») надзвычай прыгожа аздоблены геаметрычна-арнаментальным ткацтвам і вышыўкай (мал. 1). Моцна здзіўляла ўсіх «расхінная панёва» [1, 32] – адзіны ў Беларусі прыклад нясшытага паяснога жаночага адзення, – прастакутная тканіна з тканым рамбічна-крыжовым арнаментам, якая абварочвалася паверх кашулі вакол стана жанчыны і перавязвалася на таліі чырвоным плеценым поясам, які завязвалі канцамі назад. Неглюбскі строй – сапраўдны шэдэўр нацыянальнага касцюма (мал. 2). Самыя вядомыя нацыянальныя калекцыі і зборы (Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, Аддзела старажытнабеларускай культуры Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі») маюць яго ў сваіх экспазіцыях аўтэнтычнага вясковага аддзення, а знаўцы і аматары імкнуцца набыць праз дылераў ці спецыялізаваныя крамы (кошт аўтэнтычнага строю можа складаць да $2000).

Унітарнае прадпрыемства «Скарбніца», якое спецыялізуецца на сучасных рэпліках нацыянальнага касцюма, прапануе неглюбскі строй па кошце $750–$1500. Дарагі варыянт вырабляецца з натуральных тканін з ручнымі ткацтвам і вышыўкай, а больш бюджэтны – з машынным аздабленнем і выкарыстаннем сінтэтыкі. Праз свой мінскі офіс і рэгіянальных дылераў атэлье «…праектуе, мадэлюе і вырабляе беларускія нацыянальныя касцюмы вышэйшай якасці і ідэальнага падабенства з арыгіналам… касцюмы карыстаюцца папулярнасцю ў беларускіх дыяспар па ўсім свеце, яны нагадваюць аб Радзіме» [6].

Неглюбскі тэкстыль XXI стагоддзя выкарыстоўваюць у вясковым інтэр'еры: ручнікі месцяцца ў чырвоным куце, люстэркі і рамкі з сямейнымі фотаздымкамі таксама імі аздабляюць, аздабляюцца і ложкі. На сценах каля ложкаў вешаюць тканыя посцілкі з выявамі птушак і кветак, на саміх ложках сцелюць стракатыя рознакаляровыя посцілкі з карункамі, зверху кладуць

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вышываныя падушкі. Нават інтэр'ер царквы аздоблены тканым і вышываным тэкстылем, як і калодзежы, ці – крыжы з абразамі ля калодзежаў Неглюбкі.

Сёння навыкі вырабу мясцовага тэкстылю перадаюцца праз навучанне ў Неглюбскім сельскім цэнтры ткацтва, які быў створаны згодна з рашэннем Веткаўскага райвыканкама № 1020 ад 7 кастрычніка 2010 года «Аб рэарганізацыі Неглюбскага сельскага дома культуры ў Неглюбскі сельскі цэнтр ткацтва», дзе працуе тры майстры (Л. В. Кавалёва, Т. П. Суглоб, Е. М. Дзямчыхіна). Каб увесці сваю традыцыйную прадукцыю на рынак, майстры Цэнтра распрацавалі і вырабляюць разнастайную сувенірную прадукцыю на аснове мясцовых тэхналогій і арнаментаў (дробныя ручнікі, сурвэткі, сумачкі, траўніцы і г.д.). Пры Цэнтры дзейнічае крама па рэалізацыі этнатавараў. У 2015 годзе калектыву Цэнтра была ўручана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за значныя дасягненні ў справе адраджэння і развіцця народных рамёстваў, захаванне і папулярызацыю традыцыйных тэхналогій вытворчасці неглюбскіх ручнікоў. Актыўную работу па падтрымцы неглюбскай тэкстыльнай традыцыі вядзе Веткаўскі музей старaабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава (асабліва яго Гомельскі філіял), які мае найбуйнейшую ў краіне калекцыю неглюбскага ткацтва, вышыўкі і адзення, значная частка якой – антыкварныя высокамастацкія рэчы.

Неглюбчане імкнуцца актыўна «прасоўваць» сваё мастацтва на рынку і ў СМІ. Сёння яно прадстаўлена нават у далёкіх ад традыцыйнай культуры анлайн-гульнях: вучань 9 класа Уладзіслаў Навуменка распрацаваў інтэрактыўную гульню «Пазл "Неглюбскі рушнік"» [5]. Неглюбскія ручнікі перадаюцца ў якасці падарункаў у дыпламатычныя місіі многіх краін, а Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку падаравалі 30-мятровы неглюбскі ручнік-абярэг «Кола жыцця», які быў створаны мясцовымі майстрыхамі і сімвалізуе 30 гадоў, якія мінулі з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Ручнік прапанавалі захоўваць у Палацы Незалежнасці, каб ён аберагаў краіну ад войнаў і катастроф [3].

Традыцыйны неглюбскі тэкстыль захаваўся дагэтуль дзякуючы складванню своеасаблівага мастацка-культурнага ландшафту вакол вёскі і моцным сувязям у супольнасці мясцовых жыхароў. Да сярэдзіны XX стагоддзя замкнёнасць тэрыторыі ў натуральных межах рэк, балот і лясоў абумовіла лакальнасць неглюбскага традыцыйнага мастацтва і абмежавала знешнія ўплывы. Традыцыі перадаваліся паміж пакаленнямі ў час гістарычна вядомага існавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вёскі – цягам больш чым 300 гадоў. Фарміраванне мясцовага мастацка-культурнага ландшафту актывізавалася на мяжы XVII–XVIII стагоддзяў, у час шчыльнага засялення паўночных земляў Старадубскага павета Чарнігаўскай губерніі, але ў архаічнасці неглюбскага тэкстылю відавочныя сувязі з рэгіянальнай аўтахтоннай (мясцовай па паходжанні) мастацка-культурнай традыцыяй аседлых земляробаў.

Вырабы традыцыйнага тэкстылю вёскі Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці Беларусі – адмысловыя мастацкія творы, а таксама актуальныя тавары на сучасным арт-рынку антыкварыята і этнатавараў. Іх аўтэнтычныя варыянты узростам больш за 100 гадоў (антыкварыят) служаць мэтай вывучэння, калекцыяніравання і аўкцыённай актыўнасці прафесійных мастацтвазнаўцаў і антыквараў. А сучасныя рэплікі (этнатавары) прыносяць прыбытак іх вытворцам і дылерам, прадпрымальнікам сферы этна- і агратурызму, уладальнікам антыкварных і сувенірных крам. Разам з тым, неглюбскі тэкстыль на арт-рынку антыкварыяту і этнатавараў доўжыць гісторыка-культурныя традыцыі Веткаўшчыны (этнографы і мастацтвазнаўцы яе адносяць да мікрарэгіёну Пасожжа на Беларускім Падняпроўі), а таксама кансалідуе шырокія пласты беларускага грамадства вакол этнічнай гісторыі і культуры, этнаідэнтыфікацыі беларусаў як аднаго са славянскіх народаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**

**1.** Віннікава М. Традыцыйны беларускі касцюм = Традиционный белорусский костюм = Traditional Belarusian costume : альбом / М. Віннікава, П. Богдан.– Мінск: Беларуская навука, 2016. – 302 с.

**2.** Раманюк М. Беларускае народнае адзенне: Фотаальбом / М.Раманюк.– Мінск: Беларусь, 1981. – 240 с.

**3.** Прэзідэнту падарылі абярэжны ручнік дзеля захавання краіны ад войнаў і катастроф // Sputnik.by [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://bel.sputnik.by/society/20160426/1022082663.html.

**4.** Неглюбскія тэкстыльныя традыцыі Веткаўскага раёна // Жывая спадчына Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://livingheritage.by/ nks/6525/.

**5.** Навуменка У. Пазл «Неглюбскі рушнік» // Інтэрактыўныя гульні па беларускай мове і літаратуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://intgulni.blogspot.com.by/2015/01/blog-post_17.html.

**6.** Скарбніца [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://skarbnica.by/produktsiya/kostyumy/narodnyj-kostyum.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Калініна Лариса Анатоліївна,**
*кандидат педагогічних наук*
*старший викладач кафедри культурології*
*ВП «Миколаївської філії*
*Київського національного університету*
*культури і мистецтв»*

# ПРОБЛЕМИ ФОРМУВАННЯ КРЕАТИВНОЇ КОМПЕТЕНТНОСТІ СТУДЕНТІВ ВНЗ КУЛЬТУРИ І МИСТЕЦТВ

Креативна освіта є орієнтованою на розвиток творчих здібностей людини і закріплення в її професійній свідомості установок на пошук інновацій, аналіз проблем і варіантів діяльності, мотивуюча самостійне осмислення дійсності, самопізнання власної індивідуальності, перетворення знань на потенціал мислення і саморозвитку. Така освіта характеризується такими ознаками, як системна побудова освітнього процесу, орієнтованість освітніх технологій на розвиток творчого потенціалу, різноманітність методів навчання, збалансованість теоретичних знань і практичних навичок, проблемність і безперервний розвиток знань, активна участь студентів у формуванні освітніх програм, позитивна мотивація креативності..

Головною потребою сучасної епохи є потреба в людях, які мають високий рівень освіченості, і є творчими та розвиненими. Вирішити дану проблему може система вищої освіти, яка за вдалої організації навчально-виховного процесу, може озброїти майбутнього фахівця не тільки глибокими знаннями та практичними вміннями з обраної спеціальності, але й зробити його конкурентоспроможнім, висококваліфікованим фахівцем на ринку праці. Тому одним із головних завдань сучасної системи освіти є перехід до креативних методів навчання, які забезпечують формування творчої особистості [1; 2; 5].

Потреба вдосконалення системи професійної підготовки майбутніх фахівців для культурно-дозвіллєвої сфери, яка базується на широкому спектрі креативних технологій викладання є досить актуальною, це підтверджує М. Левенець, яка констатує що «культурологічна освіта у ВНЗ України переживає сьогодні важку ситуацію, пов`язану з формуванням нових стратегій і моделей розвитку як всієї, так і культурологічної освіти, основу якої становлять принципи глобалізації й регіоналізації, інтеграції й диверсифікованості освітніх структур, уніфікованості напрямів

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ